# НАПЕРАД, ЗА МАРАЙ!

## БДАТУ: «РЫХТУЕМ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ ПАД ЗАПЫТ ЧАСУ»




У арсенале Беларускага дзяржаўнага аграрнага тэхнічнага ўніверсітэта сапраўды вельмі шмат «плюшак» для студэнтаў. Па-першае, гэта адзіная ВНУ ў краіне, дзе практыка-арыентаваная вучэбная праграма складае 70 %. Паралельна з вышэйшай адукацыяй студэнты БДАТУ маюць магчымасць атрымаць працоўныя прафесіі —слесар па рамонце сельскагаспадарчых машын і абсталявання, электраманцёр па рамонце і абслугоўванні электраабсталявання. А яшчэ могуць атрымаць пасведчанні кіроўцы механічных транспартных сродкаў катэгорыі «B», кіроўцы колавых трактароў катэгорый «C» і «D» і самаходных машын сельскагаспадарчага прызначэння катэгорыі «F».

Па словах **першага прарэктара БДАТУ Аляксея МІРАНОВІЧА**, у сёлетнюю ўступную кампанію ўніверсітэт набярэ амаль 1,3 тысячы першакурснікаў:

— З кожным годам кантрольныя лічбы прыёму павялічваюцца. Так, у 2026 годзе мы прымем 560 абітурыентаў на дзённую бюджэтную форму навучання — гэта на 95 месцаў больш, чым летась. Павялічылася колькасць месцаў і на завочнай форме навучання.

Рост колькасці бюджэтных месцаў першы прарэктар звязвае з патрэбай заказчыкаў кадраў у спецыялістах такіх кірункаў, як ахова працы,



энергетычнае забеспячэнне сельскай гаспадаркі, аграбізнес, менеджмент. Павелічэнне набору на інжынерна-тэхнічныя спецыяльнасці на 60 месцаў і на эканамічныя і кіраўніцкія — на 35 у суме і даюць лічбу агульнага павелічэння месцаў — 95.

Не губляе сваёй актуальнасці і мэтавая падрыхтоўка. **Дэкан факультэта давузаўскай падрыхтоўкі і прафесійнай арыентацыі моладзі, адказны сакратар прыёмнай камісіі БДАТУ Карына ГАРКУША** адзначыла, што цяпер вядзецца актыўная праца з заказчыкамі кадраў:

— У нас, у адрозненне ад іншых універсітэтаў, на два дні падоўжаны прыём на бюджэтную форму атрымання адукацыі. Тыя, хто не вызначыўся ці не вельмі добра здаў ЦЭ або ЦТ, могуць прыйсці ва ўніверсітэт, падаць дакументы і здаць унутраныя ўступныя іспыты. Што датычыцца конкурсаў і прахадных балаў, то яны ў 2025 годзе ў адносінах да папярэдняга па некаторых спецыяльнасцях павялічыліся на 40—45 балаў, як, напрыклад, на спецыяльнасцях «Ахова працы на вытворчасці» і «Энергетычнае забеспячэнне сельскай гаспадаркі».

Добры конкурс будзе і сёлета, упэўнена яна.

Інжынерныя і эканамічныя кадры для АПК універсітэт рыхтуе больш за 70 гадоў. З часам прыярытэты мяняюцца — іх вызначае эканоміка. Тое, што было запатрабавана ў сельскагаспадарчай галіне і ў студэнтаў вядучай аграрнай ВНУ краіны яшчэ гадоў дзесяць таму, сёння страчвае актуальнасць.

— Цяпер абітурыентаў часцей прыцягваюць спецыяльнасці аграэнергетычнага факультэта, — дзеліцца Аляксей Міранович. — Такія як «Аўтаматызацыя тэхналагічных працэсаў і вытворчасцяў» і «Энергетычнае забеспячэнне сельскай гаспадаркі». Заўсёды дастаткова высокі конкурс на спецыяльнасці «Тэхнічны сэрвіс у АПК». БДАТУ — адзіная ў Беларусі ВНУ, якая вядзе падрыхтоўку па спецыяльнасці «Ахова працы на вытворчасці». У топе і такія спецыяльнасці, як «Тэхнічнае забеспячэнне працэсаў сельскагаспадарчай вытворчасці», «Тэхнічнае забеспячэнне працэсаў захоўвання і перапрацоўкі сельскагаспадарчай прадукцыі». Вельмі высокім попытам у абітурыентаў карыстаюцца спецыяльнасці факультэта прадпрымальніцтва і кіравання: «Аграбізнес» і «Менеджмент».

## БДУІР: «НЕ ПА БАЛАХ, А ПА ПРЫЗВАННІ»

Першае пытанне, якое мы задалі **рэктару Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі Вадзіму БОГУШУ**, было: «Чаго чакаць будучым абітурыентам, якія прыглядаюцца да бюджэту?»

— Не трэба чакаць, трэба настройвацца, — адказаў ён. — Спачатку — на паспяховую здачу цэнтралізаванага экзамену, затым — цэнтралізаванага тэсціравання. Потым трэба настройвацца на тое, каб выбраць спецыяльнасць не па балах, а па прызванні, па душы. А далей трэба настройвацца ўжо на сур'ёзную працу, таму што вучыцца ў БДУІР не прасцей, чым паступіць у яго.

Штогод універсітэт прымае каля 3 тысяч першакурснікаў. Сёлета, паведаміў рэктар, яе планаваная лічба крыху меншая — 2887. Аднак у параўнанні з мінулым годам бюджэтных месцаў стала крыху больш, а платных — менш.

— Але ўступная кампанія пакажа, як будуць разгортвацца падзеі, — удакладняе Вадзім Анатольевіч. — На дзённую бюджэтную форму плануецца залічыць 1297 чалавек, з іх на ваенны факультэт — 127. На платную форму навучання прымуць 1490 студэнтаў. Я чакаю, што намечаныя планы выканаем.

Абітурыентам БДУІР сёлета прапануе 16 спецыяльнасцяў бакалаўрыяту, 19 спецыяльнасцяў магістратуры і 30 спецыяльнасцяў аспірантуры. Па словах рэктара, новых спецыяльнасцяў у гэтую ўступную кампанію не чакаецца, затое адкрываецца новая прафілізацыя па кібербяспецы.

Увогуле спектр спецыяльнасцяў у БДУІР дастаткова шырокі, разлічаны на любыя тэхнічныя прыхільнасці і здольнасці. Абітурыенты могуць выбраць кірункі ў сферы высокіх тэхналогій, уключаючы распрацоўку праграмнага забеспячэння, тэлекамунікацыі, электроніку, кібербяспеку і інжынерна-эканамічную дзейнасць.

Папулярныя спецыяльнасці «Праграмная інжынерыя», «Інфармацыйныя сістэмы і тэхналогіі», «Інфарматыка і тэхналогіі праграмавання», «Інфармацыйная бяспека». Запатрабаваныя эканомікай — «Электронныя сістэмы і тэхналогіі», «Радыёсістэмы і радыётэхналогіі», «Нанатэхналогіі і нанаматэрыялы», «Інжынерна-педагагічная дзейнасць», «Мікра- і наноэлектроніка». Дарэчы, для гэтых спецыяльнасцяў прадугледжаны льготы для медалістаў і пераможцаў абласнога (Мінскага гарадскога) этапу рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах.

**Алена ВІНАГРАДАВА**
**Фота Лізаветы ГОЛАД**

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

**Несвижское районное потребительское общество**
(организатор электронных торгов, продавец)
ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

**Лот: капитальное строение с инв. № 621/С-1029639,** наименование – **Магазин № 63,** общая площадь 73,6 кв. м, расположенное по адресу: **Минская обл., Несвижский р-н, г. п. Городея, ул. Комарова, 3.**

Начальная цена – 49 524,00 бел. руб. с учетом НДС 20 %.
Шаг электронных торгов – 5 %.

Порядок проведения электронных торгов определен регламентом электронной торговой площадки torgi.gov.by(далее – ЭТП).

Детальная информация об электронных торгах, в том числе об оформлении участия в них, условиях торгов размещена на ЭТП.

Электронные торги состоятся **18.05.2026 г. в 08.00** на электронной торговой площадке **torgi.gov.by.**

Для участия в электронных торгах на электронной торговой площадке по электронному адресу https://torgi.gov.by необходимо подать заявку на участие в электронных торгах и пройти регистрацию в качестве участника электронных торгов, а также перечислить задаток в срок до 18.05.2026 до 08.00.

Задаток в размере 10 % перечисляется на р/с BY88 BELB 3012 0027 8700 2022 6000 ОАО «БанкБелВЭБ», УНП 190318109, БИК BELBBY2X. Получатель платежа – РУП «Информационный центр Министерства экономики Республики Беларусь».

Информация о проведении электронных торгов опубликована на сайте **torgi.gov.by.**

Информация по тел.: **(801770) 2-55-67, (8033) 67-555-67**

**ДОПОЛНЕНИЕ к проектной декларации ООО «СМУ-87»,**

***опубликованной в газете «Звязда» 11.02.2025 г.* по объекту «Возведение жилой застройки по ул. Мястровской в м-не Лебяжий г. Минск»**

Для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, в жилом доме № 1 по г/п с пристроенным двухэтажным гаражом-стоянкой предлагаются:

**20 (двадцать)** однокомнатных квартир **площадью от 33 до 39 кв. м**, стоимость 1 кв. метра **от 6560 до 7500 белорусских рублей;**

**15 (пятнадцать)** однокомнатных квартир **площадью от 40 до 50 кв. м**, стоимость 1 кв. метра **от 6400 до 7500 белорусских рублей;**

**2 (две)** двухкомнатные квартиры **площадью 51-62 кв. м**, стоимость 1 кв. метра **от 6900 до 7900 белорусских рублей;**

**10 (десять)** двухкомнатных квартир **площадью от 77 до 97 кв. м**, стоимость 1 кв. метра **от 5277 до 6000 белорусских рублей.**

На предприятии действует система регулирования стоимости, зависимая от площади, этажа и условий оплаты строящегося объекта.

Оплата производится в белорусских рублях. Указанные цены действуют до момента опубликования новой проектной декларации, дополнения или изменения к ней и при условии наличия квартир, предложенных для заключения по договорам создания объектов долевого строительства.

**Условия оплаты квартиры** – полная либо поэтапная оплата цены договора в соответствии с действующей в организации системой рассрочки платежей от даты следующей за днем регистрации договора долевого строительства в Комитете строительства и инвестиций Мингорисполкома.

Ознакомиться с планировками квартир можно по предварительной записи в офисе продаж «Гранд Кристал» по адресу: г. Минск, пр-т Дзержинского, д. 19, пом. 1567 по графику пн.–пт. с 9.00 до 19.00, сб., вс. – выходной, тел. 375 (44) 711-33-00.

Прием заявлений на заключение договоров создания объектов долевого строительства будет осуществляться с 9.00 следующего рабочего дня за днем опубликования настоящего дополнения в порядке живой очереди в офисе продаж «Гранд Кристал» по адресу: г. Минск, пр-т Дзержинского, д. 19, пом. 1567.

УНП 193672656

**ООО «СпецРеализация»**
объявляет о проведении торгов в форме электронного аукциона по продаже имущества ликвидируемого юридического лица – **ООО «ЗУБР АВТОГРУПП»**
(УНП 193633961, г. Минск, Минская кольцевая автомобильная дорога, 303, оф. 18).

***Дата и время проведения торгов*: 18 мая 2026 года.**

Начало – 09.00. Заявки принимаются с 16 апреля 2026 года по 15 мая 2026 года.

***Место проведения торгов:*** ЭТП ООО «СпецРеализация» www.specrealization.by.

***Организатор торгов:*** ООО «СпецРеализация» (УНП 691842036, Минская обл., Минский р-н, Боровлянский с/с, д. Копище, ул. Лопатина, 7А/1-1101), тел. 8 (029) 6847176.

***Продавец:* ООО «ЗУБР АВТОГРУПП» (УНП 193633961), в лице ликвидатора – ООО «Ад Мелиорем», в лице директора Денисова М. В., тел.** 8 (029) 5956028.

Шаг торгов – 5 %. Задаток – 2 %.

Подробная информация об имуществе, условиях торгов и порядке проведения размещена на интернет-сайте https://specrealization.by/.

Контактный телефон для осмотра лота в рабочее время (с 9.00 до 17.00) 8 (029) 6847176.

Информацию о продавце, опубликованную в извещении о проведении электронного аукциона в РИУ «Издательский дом «Звязда» (№ 63 (30702) от 02.04.2026), **считать ошибочной.**
Продавец: ООО «ЗУБР АВТОГРУПП» (УНП 193633961), в лице ликвидатора — ООО «Ад Мелиорем», в лице директора Денисова М. В., тел. 8 (029) 5956028